Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Хочаце быць шчаслівыя?

НЕ ПАРАЎНОЎВАЙЦЕ СЯБЕ З ІНШЫМІ

Як таксічныя людзі атручваюць наша жыццё?

У нашым акружэнні практычна заўсёды знойдзецца песіміст, нечым пакрыўджаны, запальчывы чалавек, вакол якога заўсёды скандалы і звадкі. Калі пасля стасункаў з ім застаецца адчуванне спустошанасці, то вось яна — таксічная асоба. Першая думка, што варта абмежаваць зносіны з такімі людзьмі, але што рабіць, калі гэта нашы блізкія, калегі ці сваякі? Як правільна з імі суіснаваць і рэагаваць на іх правакацыі, а таксама чаму важна не параўноўваць сябе з іншымі, мы паразважалі разам з псіхолагам Марыяй ГУЦЬКО.

— Хто такія таксічныя людзі? Як іх вызначыць у сваім акружэнні?

— Таксічнасць — гэта тое, што мы адчуваем, калі з кімсьці кантактуем. Пасля такіх людзей застаецца нейкі горкі прысмак, мы разумеем, што намі маніпулююць. Таксічныя адносіны, як правіла, узнікаюць з тымі людзьмі, якія ў дзяцінстве перажылі траўму, часта яны маюць псіхічнае расстройства. Бацькі лічаць, што няправільна выхоўваюць дзіця, тузаюць яго яшчэ больш, і малое адчувае яшчэ больш моцнае непрыманне яго як асобы. І пачынае адваёўваць сабе становішча ў грамадстве. У выніку загульваецца так, што, кантактуючы з такім чалавекам, заўсёды адчуваеш маніпуляцыю: як ні выбудоўвай размову, ён усё роўна апынецца «ў дамках», а ты сыходзіш з пачуццём віны.

«Таксічнаму чалавеку патрэбная эмацыянальная аддача. Як толькі мы праявілі эмоцыі, ён нас «з'еў».

У нас ва ўсіх бываюць моманты, калі праяўляецца наша таксічнасць — з-за хвароб, стрэсаў, стомленасці. Аднак здаровыя адносіны — гэта калі мы хоць і адчуваем часам нейкую таксічнаць, ды ўсё ж разумеем, што чалавек у дошку разаб'ецца, але ўсё зробіць для нас. «Мы яму — ён нам» — гэта нармальныя адносіны.

Таксічныя людзі, як правіла, разумныя, умеюць выклікаць прыхільнасць да сябе, але абсалютна не валодаюць эмпатыяй — не разумеюць, што адчувае іншы, і не могуць суперажываць. Яны дадзеную сферу для сябе перакрылі — іх і так шмат крыўдзілі, а тут яшчэ суперажываць некаму іншаму — гэта занадта. Нягледзячы на тое што яны, як правіла, цікавыя людзі, жыць з імі і кантактаваць для навакольных вельмі складана.

— Якія прыкметы ў дзяцінстве ўказваюць на тое, што расце таксічная асоба?

— Найперш эгацэнтрызм. Яго не трэба блытаць з эгаізмам. Малое сядзіць дома і раптам яму захацелася марожанага. Нармальна ў такім выпадку патэлефанаваць маме і папрасіць, каб яна купіла. Мама кажа, што стамілася і няма часу ісці ў краму, а ты, праяўляючы нармальны эгаізм, настойваеш. І нават калі мама прыйшла без марожанага, праблема неяк вырашаецца: яна дае грошы, і ты сам бяжыш па яго. Але здараецца, што дзіця хоча марожанага і не тэлефануе. І тут прыходзіць мама, якая нічога не падазрае, а дзіця ўжо ўзлаванае: ну як мама не магла здагадацца, што павінна дадому прыходзіць з сюрпрызам? У тым марожаным насамрэч схаваны пасыл «я хачу ўвагі». Вось гэта эгацэнтрызм: усе павінны здагадацца, што мне дрэнна ці, наадварот, добра.

Схільнасць да маніпуляцыі нараджае несумленнасць і падман, але за імі хаваецца нізкая самаацэнка. Чалавек не хоча выстаўляць сябе перад іншымі ў непрыгожым святле, таму пачынае падманваць, выкручвацца, звяртацца да канфліктаў. Акрамя нізкай самаацэнкі, для таксічных людзей характэрны і негатывізм. Ні ў адной сітуацыі яны не бачаць плюсоў, адны мінусы. І часам іх ствараюць самі. Нават звычайную сітуацыю яны здольныя ператварыць у негатыўную, а ты стаіш і не разумееш, што здарылася.

— Атрымліваецца, што таксічным чалавек становіцца ў дзяцінстве...

— Здараецца, што і ў дарослым узросце. Мы насамрэч расцём усё жыццё, і недарэмна ў нас перыядычна ўзнікаюць крызісы пэўнага ўзросту. Пасля іх мы павінны штосьці набыць: мы як бы апускаемся ў яму і мусім выйсці з яе на іншы ўзровень. Калі ж ў гэтым крызісе мы адчулі стрэс ад скасавання шлюбу, здрадніцтва, нейкай страты, то выйдзем, магчыма, не на іншы ўзровень, а адкацімся назад, у дзяцінства. І тут уключаюцца дзіцячыя механізмы: я гэтую дзяўчынку, калі што, укушу, але яна мне аддасць тое, што я хачу.

— Як кантактаваць з таксічнымі людзьмі, калі гэта, скажам, калега?

— У нас заўсёды ёсць магчымасць штосьці змяніць: абмежаваць час кантакце, памяняць работу. Калі гэта начальнік, то часам лепш проста сысці. Калі калега, то скараціць кантактаванне з ім і зрабіць яго безэмацыянальным. Размаўляць толькі па справе і прыгожа сыходзіць кожны раз: «Я не супраць з табой пагаварыць, але ў мяне толькі дзесяць хвілін» ці «А, ты зноў пра гэта, я тут табе не дарадчык». За 10-15 хвілін яшчэ не знервуюць і ваш рэсурс захаваецца. У выніку калега проста стоміцца ад таго, што яго не прымаюць. Таксічнаму чалавеку патрэбная эмацыянальная аддача. Як толькі мы праявілі эмоцыі, ён нас «з'еў». Ёсць так званая тэхніка шэрага каменя, якая мае на ўвазе не рэагаваць эмацыянальна. Вяртаць тое, што вам сказалі. Напрыклад, ён кажа: «Ты, як звычайна, сеў у лужыну». Спакойна адказвайце: «Так, як звычайна, сеў у лужыну». Але прымяняць такую тэхніку не кожны здолее.

Ёсць людзі, якія сябруюць з «токсікамі». Сварацца з імі, клянуцца, што той страшны чалавек, але насамрэч падпітваюцца негатыўнай энергіяй, атрымліваюць эмацыянальную разрадку.

Тут важна самому дакладна разумець, што ты можаш дапусціць, а што ўжо занадта. Калі ўсведамляеш, што вось тут я пацярплю, становіцца прасцей.

— А ці варта ўвогуле цярпець?

— Да кожнай сітуацыі індывідуальны падыход. Калі таксічны ваш начальнік, але вам падабаецца тут працаваць, то кожны раз трэба разумець, што табе трохі падкінулі, затое ўсё астатняе вельмі нядрэнна.

— Як паводзіць сябе, калі таксічны чалавек — член сям'і?

— Ёсць выпадкі, калі людзі ўвогуле перастаюць кантактаваць з блізкімі і іх можна зразумець. Як паказвае вопыт, праз нейкі час у душы бацькі, сястры, брата, магчыма, нават праясніцца штосьці. Напрыклад, калі «таксічная» маці, і ёсць сястра, якая ўсё расказвае маме, а вам гэтага не хочацца, трэба канкрэтна акрэсліць межы: я з табой, сястра, сустракаюся, але давай мы не будзем гэта расказваць маме.

Таксама можна прымяняць методыку «шэрага каменя», але яна згубная для нас саміх, бо наш эмацыянальны бок заглушаецца. Можна прымяняць таймінг: «Мама, у мяне дзве гадзіны на застолле, потым я з'язджаю дадому». Паменш спіртнога, бо, як правіла, усе сямейныя сцэны адбываюцца падчас сумесных вячэр ці абедаў.

«Таксічныя адносіны ўзнікаюць з тымі людзьмі, якія ў дзяцінстве перажылі траўму, часта яны маюць псіхічнае расстройства».

Так, калі вы перастаяце кантактаваць з таксічным сваяком, у вас не будзе такой сферы жыцця, як бацькоўская сям'я. З гэтым трэба змірыцца, пагадзіцца і прабачыць. Але вы дарослы чалавек, самі ствараеце сваю сям'ю і стараецеся ўсё рабіць так, каб у ёй было па-іншаму.

— А калі таксічным аказваецца ваш блізкі сябар?

— Калі пачынаюцца скаргі, дапамагае пераключэнне на іншую тэму, беззмацыянальнае агучванне: «Дык у цябе праблема з мужам? Чаму ты сама не можаш яму гэтага сказаць?» Як правіла, яны больш здагадваюцца, фантазіруюць і жывуць у прыдуманым свеце, гэта вельмі адчувальныя людзі, нягледзячы на тое, што яны не валодаюць эмпатыяй.

— Як правільна выбудоўваць з імі стасункі і суіснаваць?

— Гаварыць «не», калі няма рэсурсу выслухоўваць: «Не, не магу, прабачце, няма часу». Рабіць сябе крыху недаступным, занятым. Яны ўсё выдатна зразумеюць. Другі момант — памятаць, што вы не вінаватыя ў гэтых адносінах. Бо часта такое здараецца ў пары — у адзін «цудоўны» момант ваш партнёр паказвае свой «выскал». Таму тут трэба ўсведамляць, што гэта не вы нявартыя, а проста такі чалавек, на якога вам не пашчасціла трапіць. Як правіла, такія людзі, каб завяваць «ахвяру», адлюстроўваюць усё, што мы думаем і любім. А потым рэзка аказваецца, што «я ненавіджу тваю рыбалку». Іх адчувальнасць дазваляе лёгка зацягнуць цябе ў сетку, а потым, калі ты становішся «сваім», можа зламаць.

Ну і яшчэ адзін момант — каб не адчуваць сваёй віны, пастарайцеся не дапамагаць такім людзям. Бо што ні зробіш, яму ўсё дрэнна, — ва ўсіх атрымалася, у яго аднаго — не. І вінаватымі застаяцеся вы. Таму казаць «не» — гэта ваша выратаванне.

— Якія памылкі нельга рабіць бацькам у выхаванні, каб дзіця не вырасла таксічным?

— Часам на кансультацыю прыходзяць бацькі з дзецьмі, і відавочна, што гэта зламанае дзіця. Праявы могуць быць розныя — заіканне, трывожнасць. Перфекцыянізм бацькоў прыводзіць малога да ўласнага перфекцыянізму і боязі памылак. Нават калі вы памыліліся і накрычалі на дзіця пасля цяжкага дня, гэта не страшна. Даследаванні паказваюць, што бацькоўскія памылкі не настолькі дрэнна адбіваюцца на дзіцяці, яно робіць свае высновы. Мы ўсе памыляемся, але важна вырашыць сітуацыю, папрасіць прабачэння, сказаць, што «я ў дзяцінстве быў такі самы». Бацькам вельмі важна ўтаймоўваць амбіцыі час ад часу.

«Таксічныя людзі, як правіла, разумныя, умеюць выклікаць прыхільнасць да сябе, але абсалютна не валодаюць эмпатыяй — не разумеюць, што адчувае іншы, і не могуць суперажываць».

Як правіла, «токсікі» нараджаюцца ў таксічных бацькоў, нарцысаў, аб'юзераў, алкаголікаў, залежных людзей. Але бывае, што таксічнасць з'яўляецца пасля псіхалагічнай траўмы ці іншых драматычных падзей у жыцці. Важна граматна рэагаваць на іх, паказваць дзецям, што і як рабіць на сваім прыкладзе. Калі бацька выпівае і маці кажа: «Так, тата выпіў, але мы яму даруем і дапаможам справіцца з хваробай» — гэта адно. І зусім іншае — маміны скандалы, яе падрыхтоўка да таго, што тата «зноў прыйдзе п'яны» — «Я яму пакажу!», — і дзеці ва ўсім гэтым існуюць. Так мы атрымліваем таксічных людзей.

— Як змагацца з таксічнасцю ў сабе?

— Каб быць шчаслівымі, важна не параўноўваць сябе з іншымі. Калі адчуваеш, што павышаецца ўласная таксічнасць, кажаш сабе: стоп, я не буду параўноўваць сябе з іншымі. І адразу ўсё становіцца на свае месцы.

Простая мова

ПТУШКІ, ЯК ЛЮДЗІ,

альбо Розум прыходзе па шкодзе

Мястэчка — паводле слоўніка — вялікае сяло з прыкметамі горада, што відавочна — марожанае тут — ну амаль «як там»: проста вочы разбягаюцца! Цяжка выбраць, калі не ведаць, як гэта робяць іншыя. Мужчыны:
— У вас ёсць марожанае?
— Ёсць.
— Давайце.
Жанчыны:
— У вас ёсць марожанае на палачцы, з вішнёвай начынкай, у шакаладнай глазуры, пасыпанае какосавай стружкай?
Дзеці:
— У вас ёсць марожанае за рубель?
Кожнаму сваё. І добра ж, калі ёсць!

Без навукі — як бязрукі...

Наготкі расцвілі — разгарнулі свае яркія сонечныя пялёсткі. І тым самым зноў нагадалі, як адну вясковую жанчынку (двое дзетак малых) палажылі ў бальніцу з падазрэннем на анкалогію, як яна там не ела-не спала, плакала... Як пачула ў калідоры, што ўсе жаночыя хваробы вельмі добра лечацца настойкай календулы, і як перажывала, што гарадскія жанчыны тую календулу, вядома ж, дастануць. А вось ёй у сваёй глухмені... Куды пайсці, у каго спытацца?

...Трохі пазней дазналася, што календула — не што іншае, як наготкі, кветкі-самасейкі, якія сама ж і ў сваім гародзе кожную вясну выполвала і якія там усё роўна цвілі.

Нібы ведалі, што спатрэбяцца.

Слова?..
Часам дастаткова!

«Яблычак ад яблыні далёка не коціцца: калі бацька неахайнік, дык і дзеці такія ж», — уздыхала бабуля, бо яно і сапраўды, малыя па хаце прабеглі — што мамай прайшоў. І хоць бы ж хлопчыкі, а то...

«Кніжкі ў сумцы, хлопцы ў думцы», — потым пасміхаўся дзед, бачачы, што ўнучкі дзесьці ў аблоках.

...Той дзень, праўда, «прызямліліся»: сталі вучыцца сырнікі пячы. У працэсе, як выглядае, выляталі некуды з хаты.

Факт, што дзед, адчыніўшы дзверы, у муку запэцкаў пінжак і сказаў: «Відаць, што Акуліна пірагі пякла: усе вароты ў цесце».

Унучак яго звалі, вядома ж, не так, але намёк яны зразумелі: кантралююць сябе... Хоць зрэдку.

Вострае пытанне

Лета. Вёска. Па вуліцы рассякаюць малыя раварысты, *над* вуліцай носяцца буслы.

Адзін з іх зранку «тармозіць» на слупе: стаіць (на адной цыбатай назе), наводзіць марафет — дзюбай вычышчае пер'е на крылах, адкідвае галаву і патыліцай сам сабе чухае спіну, з цікавасцю пазірае на людзей... І яны, вядома ж, таксама — задзіраюць галовы, любуюцца, нават не моўчкі:

— Ну што, брат, дажыўся? Падгадаваў дзяцей на сваю галаву? — пытае бусла знаёмы вясковец. — Сам уцёк альбо выгналі? І з людзьмі такое бывае. Кватэрнае пытанне — яно, бачыш, усіх дастае — і *на* вуліцы, і *над*...

Іншыя часы...

Даўняя гісторыя. Жылі-былі тры сяброўкі. Адна ў той дзень і з самага ранку па камсамольскай пуцёўцы ад'язджала на цаліну, дзве другія — хацелі праводзіць. Прычым не проста пасадзіць у вагон і там развітацца, а разам даехаць да наступнай станцыі, а потым — вярнуцца...

(Хто ж думаў, што тая станцыя — праз сотню вёрстаў, і цягнік дадому толькі ўвечары!).

Факт, што пакуль яны дачакаліся ды пакуль дабраліся, маці іх усе вочы праплакалі: баяліся, *што іх дочкі разам з той сяброўкай ужо на цаліне.*

Заўважце: нейкіх іншых думак (накшталт укралі, згвалтавалі, напаілі, збілі і г. д.) у галовы ім не прыходзіла, і ў міліцыю яны не звярталіся.

Трэба разумець, іншыя былі часы — іншыя норавы.

Думы за гарамі...

«Бог сем пар лапцяў сталтаў, пакуль пару сабраў» — кажуць гэтак пра многіх... Пра Юлю з Віцем таксама, бо яны — абое — не проста прыгожыя (кожны сам па сабе), яны да ўсяго падобныя — высокія, чарнявыя, стройныя... «Хоць у кіно здымай!.. Ці ў «Алесю» на вокладку! — кажам Віцевай маме. — Цікавая пара!»

«Ага... Ды яшчэ і якая, — цяжка ўздыхае жанчына. — Дзесяць гадоў ужо разам жывуць! Каб па-людску ўсё, каб, як некалі ў нас — злюбіліся, пажаніліся, — дзеці, можа, у школу ўжо хадзілі б! А так...»

У маладосці і сапраўды чалавеку здаецца, што часу наперадзе — проста нямерана, што сто разоў яшчэ ўсё паспееш, што галоўнае — не сям'я, ва ўсякім разе ў 30...

У 40, магчыма, дойдзе, што «кар'ера не будзе чакаць цябе дома», што «грошы не вытруць слёзы, а слава не абдыме ноччу», што народ каліскі праўду казаў: думы за гарамі, а смерць за плячамі.

Супраць лома...

Вечар, тралейбус, вольнае месца, але ж не да чытва: дзве маладзіцы побач уселіся, шчабечуць — проста не змаўкаючы. Старэйшая расказвае, што замуж ідзе пляменніца (роднай сястры дачка), што жаніх на сем гадоў старэйшы, багаты і родам з Пісцера, што вяселле адбудзецца там, у рэстаране, што *не ехаць* ёй проста нельга... Але ж і ехаць не выпадае, бо дырэктар не адпускае з работы.

— Дык ты заяву напішы, — раіць маладзейшая, — за свой кошт.

— Ты думаеш, я за чужы хацела? Не, за свой... У нас проста начальнік такі. Абы крыві папіць. Я тры разы да яго хадзіла: і заявы пісала, і прасілася, нават плакала. А ён упёрся рогам...

— Слухай: дык можа бальнічны нейкі зрабіць?

— Я пра гэта ўжо думала... Але ж, кажуць, ён сам захварэў.

— Дык, можа, памрэ?

Няма роду без выроду?

Што было, тое было: па тэлевізары паказвалі.

Сталіца, крама, натоўп і там — дзве «вароны»: адна — маладая — «пасеяла» свой кашалёк, другая — пенсійнага ўзросту — падабрала і паклала ў сумку сабе.

Камеры назірання гэты працэс добрасумленна знялі, тэлебачанне ўвечары паказала.

І тым самым нагадала абвестку ў гардэробе: «Калі ласка, не пакідайце ў кішэнях каштоўныя рэчы, таму што гардэробшчыца з зарплатай у 350 рублёў за сябе не адказвае».

А павінна!

Класіка (праўда, з іншай нагоды): «Всё это было бы смешно, когда бы не было так грустно».

Розум прыходзе па шкодзе

Заўважана: асобныя хворыя хварэюць даўжэй, чым здаровыя жывуць.

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Так і з Пятроўнай было: неспадзеўкі аўдавела, адна засталася ў пустым вялікім доме. «Можа, кватарантаў якіх узялі б?», — раілі радня і суседзі, але жанчына не слухала. Казала, што добрыя людзі па чужых кутах туляцца не будуць, а дрэнныя — ёй без патрэбы. Адна перабівалася, пакуль...

Напрадвесні, казалі, вечарам на вуліцу выйшла і паслізнулася. Намагалася ўстаць, — не змагла, хацела пазваніць — мабільнік дома застаўся, паспрабавала пакрычаць, паклікаць на дапамогу — ніхто не пачуў.

А быў бы побач нехта жывы, хай сабе і дрэнны...

Позна.

Розум, як той казаў, прыходзе па шкодзе. І часам — калі нічога ўжо не выправіш.

За здароўе!

Пытанне армянскаму радыё: калі наш мужчына купляе новы спартыўны касцюм?

Адказ: калі збіраецца ў санаторый альбо кладзецца ў бальніцу.

Ні ў першае з гэтых месцаў, ні ў другое Аляксеевіч не збіраўся, а таму хадзіў у старым, бо добры яшчэ, жонка — майстрыха, або латкі на каленях паставіла...

А тут, як на ліха, нейкі кашаль усчаўся, тэмпература ўверх папаўзла — пад 40... Давялося «хуткую» выклікаць, потым спешна збірацца — ехаць у бальніцу.

— Што з сабою браць? — спытаўся ў медыкаў.

Тыя казалі, ён у сумку складаў — той самы спартыўны касцюм, тапкі, рушнік, шкарпэткі, кубак, лыжку, расчоску, зубную шчотку... Здаецца, нічога не забыў?

І ў бальніцы, дзякаваць Богу, не затрымаўся. Зрабілі там патрэбныя аналізы, прызначылі антыбіётыкі, з тыдзень пакалолі і як быццам ажыў чалавек: ва ўсякім разе, перад выхаднымі выпрасіўся з бальніцы.

...Жонка з сынам з той радасці святочную вячэру зрабілі, а затым — сталі яго сумку разбіраць. Лыжка на падлогу выпала.

— Ты што, — здзівілася жонка, — чайную браў? Чаму?

— Можна падумаць, я ў бальніцах ляжаў... Адкуль мне ведаць, якую трэба?

— І што — ёю там суп еў?

— А як жа...

— Цырк! — зарагаталі сямейнікі. — Маленькай лыжачкай, у залатаных портках... Дык вось чаму ты ўжо дома!

...«За здароўе! За самае галоўнае!» — найпершы тост.

А ў медыкаў, кажуць, ёсць яшчэ і свой, адмысловы: «Каб бедныя ніколі не хварэлі, а багатыя — не папраўляліся».

Птушкі, як людзі...

Зімой гэтая хатка (старая, маленькая, але побач з рэчкай) стаіць пустая. Затое летам — кітайскае насельніцтва, можна сказаць, бо з'язджаюцца і дзеці, і дзеці дзяцей, і нават унукі ўнукаў...

Днямі адзін такі, чатырохгадовы, цэлы дзень на ровары гойсаў — без шапачкі. Пад раніцу капрызіць стаў, жаліцца, што вушка баліць. Бабуля, як магла, суцяшала, чым магла — палячыла, ды каб іншых не будзіць, ухутала малога ў старую вялікую хустку — вынесла ў двор. І хадзілі яны там, і сядзелі, нават падрамалі ў стажку...

Пасля чаго малы з тыдзень усім расказваў, як ноччу дыхала кароўка (у суседскім хляве), як падалі з неба зоркі, як шумеў у яблынях вецер. А галоўнае (амаль даслоўна), як прачнуўся ў буслянцы бусел, як пацалаваў сваю бусліху і адразу паляцеў на балота, каб што-небудзь смачнае прынесці сваім бусляняткам.

...Усё амаль тое ж шторaніцы (ці трэба казаць?) рабіў дзядуля гэтага хлопчыка. І ягоны бацька.

Некалі (спадзявацца ж можна?) тое самае будзе рабіць ён сам.

Пошук

Як ёсць, так ёсць: мужчыны, шчаслівыя ў першым шлюбе, лягчэй згаджаюцца на другі. Пятровіч толькі з паўгода ўдаўцом пабыў і зноў прыжаніўся. Хваліўся, што дужа пашчасціла, бо гаспадыня ў яго — якіх пашукаць! І ў хаце, маўляў, парадак трымае, і на лецішчы ўсё расце...

Якраз адтуль яны ў суботу і вярталіся. У яго за спінай цяжкаваты заплечнік быў, у яе — дзве «торбы» ў руках. Паставіць не паспела — і аўтобус крануўся, і яна...

Няўдала «прызямлілася». Амаль два месяцы ў бальніцы праляжала, а потым і дома яшчэ. «Толькі і чуў ад яе: гэта падай, тое прынясі, — успамінае «муж». — Абрыдла няньчыцца. Пазваніў яе дочкам: «Забірайце, маўляў». Не скажу: ад слова і прыехалі, і забралі. А я цяпер во зноў халасцяк».

...Як ёсць, так ёсць: мужчына любіць жонку здаровую, а сястру багатую.

Ён жа — шчаслівы ў першых двух шлюбах — лягчэй уступае ў трэці.

Шчасце — гэта...

У жаночай прыгажосці ворагаў шмат: гады, нагрузкі, стрэсы, кухня, страшней за якую, кажуць, толькі гарод.

І, напэўна ж, няпраўду, бо...

Сяброўка з бальніцы званіла. Спытала, чым займаюся? Расказала, што з раніцы палю грады («амерыканка» заела), а цяпер во завіхаюся на кухні, бо госці і хутка абед.

— А што ты гатуеш? — спытала Света (кулінарка — якіх пашукаць!)

Прыйшлося расказаць...

І пры гэтым, што называецца, «спінным мозгам» адчуць, якое ж шчасце: быць здаровым і дома — са сваёй сям'ёй, на сваім гародзе...

Каб яго зразумець, трэба (свят-свят!) апынуцца ў бальніцы?

Валянціна ДОЎНАР.